обсуждения Конституции (7 декабря 1935 г. – 10 декабря 1936 г.).
14. НАРБ. – Фонд 297. – Воп. 1 – Спр. 58. Переписка ЦП Союза мясомолочных совхозов БССР о ходе социалистического соревнования и копии договоров о социалистическом соревновании коллективов рабочих совхозов (17 февраля 1936 г. – 20 августа 1936 г.).
15. НАРБ. – Фонд 4-п. – Воп. 1. – Спр. 14253. Справки заведующего сельскохозяйственным отделом, инструктора ЦК КП(б)Б о состоянии пограничных колхозов и о состоянии партийно-массовой работы в колхозах отдельных районов БССР.
16. Дзяржаўны архіў Віцебскай вобласці. – Фонд 9742. – Воп. 3. – Спр. 33. Мацулевич М.С., воспоминания бывшей работницы завода «Красный Октябрь» о начале трудовой деятельности и участии в соревновании, получении значка отличника производства.
17. Зарубежны, А. У гасцях у знатнай стаханаўкі / А. Зарубежны // Звязда. – 1935. – 14 лістапада. – С. 3.

УДК 316.7

# САЦЫЯКУЛЬТУРНЫЯ КАМУНІКАЦЫІ ЖЫХАРОЎ БЕЛАРУСКА-РАСІЙСКАГА ПАМЕЖЖА Ў ПАЧАТКУ XXI СТАГОДДЗЯ

***Хаданёнак В.М., канд. гіст. навук, дац.***

*Віцебскі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт,*

*г. Віцебск, Рэспубліка Беларусь*

Рэферат. *У артыкуле разгледжаны асаблівасці сацыякультурных камунікацый жыхароў беларуска-расійскага памежжа ў наш час. Асаблівая ўвага звернута на захаванне культурна-гістарычнай самабытнасці грамадства ў памежных рэгіёнах.*

Ключавыя словы: памежжа, геапалітыка, культурная самабытнасць, міжэтнічныя кантакты, сацыякультурныя камунікацыі, ідэнтычнасць.

Беларуска-расійскае памежжа даволі ўнікальны і спецыфічны рэгіён на геапалітычнай карце Ўсходняй Еўропы. Яго геаграфічныя абрысы акрэсліць дастаткова складана, бо разглядаемыя землі адносіліся да розных дзяржаўных утварэнняў і не былі статычнымі ў прасторава-часавым кантынууме. Сёння пад беларуска-расійскім памежжам прынята разумець тэрыторыю асобных раёнаў 6 абласцей: Віцебская, Магілёўская, Гомельская (Рэспубліка Беларусь), Пскоўская, Смаленская, Бранская (Расійская Федэрацыя). Лёс гэтых земляў на працягу стагоддзяў быў даволі незайздросны. Яны з'яўляліся своеасаблівым яблыкам раздору і неаднаразова пераходзілі з рук у рукі кіраўнікоў розных дзяржаўных утварэнняў. Тут варта ўзгадаць памежныя войны Вялікага княства Літоўскага і Маскоўскага княства 1492 – 1494 гг., 1500 – 1503 гг., войны за Смаленск, узброеныя канфлікты пачатку і сярэдзіны XVII ст. і інш. У першай чвэрці XX ст. лёс гэтых тэрыторый вызначаўся пераважна мірным шляхам, шляхам дыпламатычных перамоў, але пры гэтым даволі часта не ўлічваліся меркаванні і жаданні насельніцтва гэтых рэгіёнаў.

Сёння мы маем даволі няпростую геапалітычную сітуацыю ў свеце. Зноў разгарэліся адкрытыя ваенныя канфлікты, цэлы шэраг вострых супярэчнасцяў носяць латэнтны характар. Нягледзячы на гэта, сацыякультурная сітуацыя на беларуска-расійскім памежжы вызначаецца міралюбівай і прыязнай атмасферай з абодвух бакоў. Не можа не радаваць наяўнасць актыўных кантактаў паміж суб'ектамі беларуска-расійскага памежжа ў эканамічнай і палітычнай сферах. Асабліва шчыльнае супрацоўніцтва адбываецца ў галіне культуры. Прычым формы гэтых сацыякультурных зносін розныя: абмен творчымі візітамі, літаратурныя вечарыны, сацыякультурныя камунікацыі пры дапамозе новых інфармацыйных тэхналогій і інш. Разам з культурнымі стасункамі суб'ектаў беларуска-расійскага памежжа назіраецца і разуменне важнасці захавання сваёй культурнай самабытнасці беларускім і рускім народам.

Безумоўна, сяброўскія адносіны Беларусі і Расіі мусяць грунтавацца на рэгулярных і чаканых, а не на выпадковых культурных сувязях. Пры гэтым важна, каб культурныя амбіцыі і завостранае самалюбства не перараслі з цягам часу ў нецярпімасць і непрыязнасць да

Витебский государственный технологический университет

ўсяго “чужога”. І ў Беларусі, і ў Расіі прысутнічае разуменне і ўсведамленне сваёй прыналежнасці да канкрэтнага этнаса, ёсць свой канкрэтны volksgeist (дух народаў) [1, с. 20]. Пры гэтым ні адзін народ не існуе ізалявана і міжэтнічныя кантакты будуць увесь час пашырацца. Цешыць тое, што апроч асобных праяваў бытавога нацыяналізма і ксенафобіі, абсалютная большасць насельніцтва беларуска-расійскага памежжа цалкам пазітыўна і прыязна ставіцца да сваіх непасрэдных суседзяў. Гэта абсалютна адпавядае асноўнай функцыі любой сацыякультурнай камунікацыі – дасягнуць сацыяльнага адзінства пры захаванні індывідуальнасці кожнага яе элемента [2, с. 433].

Тым не менш, трэба памятаць што «… элементы культуры, бясшкодныя і нават дабратворныя на ўласнай глебе, могуць аказацца небяспечнымі і разбуральнымі ў чужым сацыяльным кантэксце» [3, с. 63]. Гэта тычыцца ў першую чаргу моўнага пытання. Не сакрэт, што беларуская мова ў памежных з Расійскай федэрацыяй беларускіх рэгіёнах паступова саступае сваё месца рускай. Гэта не можа не насцярожваць, асабліва калі закранае адукацыйную сферу. Ва ўсходняй Беларусі доля беларускамоўных вучняў за апошні час скацілася з 10 % да 8 % [4], у памежных з Расійскай Федэрацыяй рэгіёнах статыстыка яшчэ больш сумная. Таму важна прымаць неадкладныя меры для стварэння у беларускіх памежных рэгіёнах сапраўднага, а не намінальнага «моўнага палімарфізма». Гэта дапаможа захаваць культурную ідэнтычнасць, традыцыі і моўную спадчыну беларускаму насельніцтву ўсходняй Віцебшчыны, Гомельшчыны і Магілёўшчыны. Толькі такім чынам можна дамагчыся грамадскай стабільнасці і высокай ступені эфектыўнасці сацыякультурных камунікацыі жыхароў беларуска-расійскага памежжа.

Такім чынам, можна сцвярджаць, што культурныя і сацыяльныя зносіны ў рэгіёне беларуска-расійскага памежжа вызначаюцца на сённяшні дзень адкрытасцю, стабільнасцю, узаемапавагай і даверам. Насельніцтва Беларусі і Расіі разглядае сваіх непасрэдных суседзяў праз прызму агульных духоўных асноваў развіцця. Захаванне культурнай самабытнасці і ідэнтычнасці абодвух народаў павінна ісці поруч са шчыльнымі стасункамі ў сацыякультурнай сферы.

Спіс крыніц і літаратуры

1. Вундт В. Психология народов / В. Вундт. – М.: Изд-во Эксмо, 2002. – 864 с.
2. Социология: энциклопедия / Сост. А.А. Грицанов, В.Л. Абушенко [и др.]. – Мн.: Книжный дом, 2003. – 1312 с.
3. Тойнби А. Дж. Цивилизация перед судом истории / А. Дж. Тойнби. – М.: Айрис-пресс, 2003. – 592 с.
4. Рэжым доступа: http://nn.by/?c=ar&i=152272. Дата доступа 22.12.2016.

УДК 94 (476)''1941/1945''

## БЕЛАРУСКАЯ САМАДАПАМОГА І ЯЕ ДЗЕЙНАСЦЬ ПА ДАПАМОЗЕ ДЗЕЦЯМ НА АКУПАВАНАЙ ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ (1941 – 1944 ГГ.)

***Бездель В.Я., канд. гіст. навук, дац.***

*Віцебскі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт,*

*г. Віцебск, Рэспубліка Беларусь*

Рэферат. *У артыкуле разгледжаны праблемы выжывання падрастаючага пакалення на акупаванай тэрыторыі Беларусі і дзейнасць Беларускай самадапамогі ў вырашэнні пытанняў дзіцячага бадзяжніцтва, беспрытульніцтва і уладкавання ў прыёмныя сем'і.*

Ключавыя словы: акупацыя, Беларуская самадапамога, калабарацыя, дзеці, сацыяльная палітыка.

Ва ўмовах масавага збяднення насельніцтва і пагрозы нестабільнасці акупацыйныя ўлады сталі праводзіць некаторыя мерапрыемствы ў сацыяльнай сферы. Аказанне пэўнай матэрыяльнай дапамогі насельніцтву было абумоўлена імкненнем пазбегнуць негатыўных настрояў у тыле нямецкай арміі і адначасова папулярызаваць палітыку, якая праводзілася акупантамі. Для гэтага ў кастрычніку 1941 г. гітлераўцы далі дазвол на стварэнне Беларускай народнай самапомачы (Беларускай самапомачы), дзейнасць якой была

Витебский государственный технологический университет